# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

БДУ

16 верасня 2004 года, чацвер, № 15 (1900)


СВЯТЫ

## Першы дзень у БДУ!

"Віват, БДУ! Віват, студэнт!" — з года ў год гэтыя словы распачынаюць святочны вечар, прысвечаны першакурснікам. Сёлета гэтыя словы гучалі ў Палацы спорту, куды на свята прыйшло амаль чатыры тысячы першакурснікаў БДУ.

Першымі на сцэне з'явіліся вядучыя: дыктар АНТ Яўген Лашкоўскі і вядучая канцэртных праграм БДУ Кацярына Саладуха. Яны павіншавалі першакурснікаў і далі старт святу. Пачалася праграма з фільма пра БДУ: на вялікіх экранах па баках сцэны слайды адлюстроўвалі жыццё галоўнай ВНУ краіны.

Пасля танцавальнай кампазіцыі ў выкананні творчых калектываў БДУ адбылося шэсце першакурснікаў — па некалькі прадстаўнікоў з кожнага факультэта. Яны занялі свае месцы каля сцэны, і пачалася самая ўрачыстая частка свята — парад дэканаў.

Пасля прадстаўлення сімволікі і сцяга БДУ з'явіўся сам рэктар, прафесар Васіль Іванавіч Стражаў. Ён павіншаваў студэнтаў і дадаў: "Жыццё кожнага чалавека складаецца не толькі са святаў. Але і будні могуць стаць святам, калі вучыцца на любімым факультэце". Напрыканцы пажадаў усім першакурснікам шчасця, здароўя і поспехаў.




Не абышлося і без традыцыйнай клятвы першакурсніка, якую разам з усімі студэнтамі прачытаў дэкан механіка-матэматычнага факультэта, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Мікалай Іосіфавіч Юрчук. Пасля клятвы адбылося ўрачыстае ўручэнне сімвалічнага студэнцкага білета.

Як вядома, сярод студэнтаў БДУ шмат таленавітых і знакамітых. Менавіта яны падрыхтавалі святочны канцэрт для першакурснікаў. Песню "Ты сёння —нумар адзін" выканалі гурт "Фэнсі" і Карыяна, якая патрапіла ў фінал конкурсу "Народны артыст". Танцавальны гурт "Крыжачок" выканаў танец "Прасцяк", студыя эстраднай песні БДУ прадставіла новую зорачку — Мішэль. Павіншавалі студэнтаў фольк-мадэрн-мюзікл "Фэст", гурт "Літарынка" і "Неруш".

Ёсць у нашым універсітэце "Цэнтр сучаснага стылю і моды "Universum Models", які прадставіў дзве калекцыі адзення. Першая — калекцыя Сашы Варламава "Іду ў манастыр": нягледзячы на назву, яркая і спартыўная. Другая — калекцыя пераможцы фестывалю "Млын моды" Лары Мамедавай "Пяць стыхій", элегантная і экзатычная.

Кульмінацыяй вечара стаў гімн усіх студэнтаў "Гаўдэамус", пад які на сцэну выйшлі ўсе ўдзельнікі свята. Не абышлося і без сюрпрызаў: падчас канцэрту быў разыграны мабільны тэлефон.

Сёлета расійскіх зорак на свята не запрасілі, затое выступіла сузор'е беларускіх спевакоў. Студэнтаў віншавалі Ларыса Грыбалёва, Нілс, Руслан Аляхно, Кірыл Слука, гурты "Атлантика", "Джей-морс", "Чехов" і іншыя.

Увогуле, свята атрымалася феерычнае, яркае і запамінальнае для кожнага першакурсніка. Можна не сумнявацца, што "Віват, студэнт!" стане першым крокам да яднання БДУ і сёлетняга першакурсніка.

*Юлія ПАПОВА*
*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

## Падведзены вынікі прыёмнай кампаніі

Пачаліся заняткі ў першакурснікаў, якія зусім яшчэ нядаўна "штурмавалі" прыёмную камісію універсітэта. Столькі маштабных і сур'ёзных пераменаў у прыёмнай кампаніі, колькі іх было сёлета, не памятаюць нават старажылы. Гэта і вызначаныя Міністэрствам адукацыі экзамены па кірунках, і новыя тэрміны правядзення ўступных іспытаў, і сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання, і форма правядзення экзаменаў у выглядзе пісьмовага тэсціравання, і адмена ільготаў медалістам, выпускнікам ліцэя БДУ і інш. Абітурыенты і прыёмная камісія з гонарам вытрымалі "ўдар" па ўкараненні навацый у практыку.

У прынцыпе, прыёмная кампанія ў БДУ пачалася ўжо ў красавіку, калі універсітэт аўральным чынам далучылі да правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. І ў прадметных экзаменацыйных камісій, і ў сакратарыята прыёмнай камісіі, на чые плечы лёг асноўны цяжар правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, зніклі выхадныя дні. Хаця універсітэт раней не прымаў удзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, у арганізацыі яго былі задзейнічаны ўсе службы БДУ, прыцягнуты найбольш вопытныя выкладчыкі і супрацоўнікі, што дазволіла правесці тэсціраванне на самым высокім узроўні: пра гэта сведчаць падзякі на адрас універсітэта ад упраўлення адукацыі Мінгарвыканкама, Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

Што датычыць уласна прыёмнай кампаніі ў БДУ, дык сёлета ў адпаведнасці з "Правіламі прыёму ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, на 2004 год" для ВНУ першай плыні былі вызначаны сціслыя тэрміны: 20—23 чэрвеня — прыём дакументаў, 2—8 ліпеня — уступныя экзамены. Акрамя таго, у адпаведнасці з Пастановай Міністэрства адукацыі № 34 ад 14 мая 2004 г. "Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Правілы прыёму..." прыёмная камісія БДУ была вымушана арганізаваць уступныя экзамены па рускай і беларускай мовах для абітурыентаў завочнай формы навучання і тых, хто паступае на скарочаны тэрмін навучання.

Калі ж улічыць, што сёлета жадаючых паступіць у БДУ выявілася ў 1,5 раза больш, чым летась, дык ясна, што адпачываць прыёмнай камісіі не даводзілася. Супрацоўнікі сакратарыята працавалі ў літаральным сэнсе круглыя суткі.

У 2004 г. набор у БДУ ажыццяўлялі 15 факультэтаў і 2 інстытуты па 80 спецыяльнасцях, кірунках і спецыялізацыях. У прыёме дакументаў былі задзейнічаны больш за 120 супрацоўнікаў тэхнічнага сакратарыята. Для павышэння эфектыўнасці працэсу прыёму дакументаў была створана грамадская прыёмная камісія з ліку студэнтаў універсітэта, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку. Каля 100 чалавек дапамагалі абітурыентам запаўняць неабходныя дакументы.

Нягледзячы на тое, што прыём дакументаў адбываўся без выхадных і за межамі графіка працы, пры такім наплыве абітурыентаў і ў такія сціслыя тэрміны без чэргаў абысціся не ўдалося. Аднак прыёмная камісія аператыўна рэагавала на абстаноўку і рабіла ўсё магчымае, каб зняць напружанасць. Гэтаму спрыяла павелічэнне колькасці членаў грамадскай прыёмнай камісіі, членаў тэхнічнага сакратарыята, змена арганізацыйнага механізма прыёму дакументаў і г.д.

Далёка не ўсе абітурыенты і іх бацькі змаглі дакладна разабрацца са шматлікімі новаўвядзеннямі ў правілы ўступных экзаменаў. Вядома, гэта вяло да залішніх хваляванняў. На працягу ўсёй прыёмнай кампаніі ва універсітэцкім гарадку было забяспечана дзяжурства медыцынскай службы, якая пры неабходнасці аператыўна аказвала дапамогу абітурыентам. Псіхалагічную дапамогу абітурыентам пастаянна аказвалі работнікі сакратарыята, супакойваючы і дапамагаючы разабрацца ў сітуацыі. Вырашыць незразумелыя пытанні ў адпаведнасці з заканадаўствам і атрымаць дапамогу ў прыняцці рашэнняў у канкрэтнай сітуацыі абітурыенты маглі ў юрыста прыёмнай камісіі БДУ.

Для правядзення ўступных экзаменаў былі арганізаваны 13 прадметных экзаменацыйных камісій, куды ўвайшлі больш за 200 найбольш вопытных выкладчыкаў універсітэта. Асаблівасцю гэтай уступнай кампаніі ў БДУ было яшчэ і тое, што ўсе экзамены адбываліся ў форме пісьмовага тэсціравання. Выключэннем былі толькі 2 экзамены: па "творчасці" на спецыяльнасці факультэта журналістыкі і спецыяльнасць "дызайн". У першым

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

ПАДЗЕІ

## Інстытут тэалогіі ў БДУ

У складзе нашага універсітэта сёлета з'явілася новае падраздзяленне — Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Інстытут тэалогіі імя святых Мефодзія і Кірылы".

На сваім пасяджэнні 2 верасня Вучоны савет універсітэта прыняў рашэнне пра заснаванне гэтага інстытута ў складзе БДУ. Гэтак быў пераўтвораны ранейшы факультэт тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта. Новы інстытут з'явіўся ў сувязі з просьбай Вучонага савета факультэта пра ўваходжанне ў БДУ ў сувязі з рэарганізацыяй ЕГУ. Рэктарам новага інстытута стаў доктар багаслоўя, прафесар Мінскай духоўнай акадэміі мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт, які дагэтуль узначальваў факультэт тэалогіі ЕГУ.

Інстытут тэалогіі мае тры кафедры: багаслоўскіх дысцыплін, рэлігіязнаўства і бібліістыкі. Усяго на пяці курсах навучаюцца 90 студэнтаў. Тут рыхтуюць выкладчыкаў тэалогіі ды рэлігіязнаўства. У Беларусі тэалагічная адукацыя ўпершыню ўключана ў свецкую універсітэцкую адукацыю. У класічных універсітэтах іншых краінаў свету падобныя факультэты прысутнічаюць традыцыйна.

Новы інстытут БДУ будзе размяшчацца там, дзе раней быў факультэт тэалогіі ЕГУ — на прасп. Ф. Скарыны, 24.

*Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Матэматыкі наперадзе

На XI Міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіядзе каманда нашага універсітэта заваявала 4 залатыя і 1 срэбраны медаль. Мерапрыемства адбывалася 23—29 ліпеня ў горадзе Скоп'е (Македонія). У алімпіядзе бралі ўдзел каманды з больш чым 40 вядучых універсітэтаў з 25 краінаў свету, у тым ліку з універсітэтаў Прынстана (ЗША), Оксфарда і Манчэстэра (Вялікабрытанія), Бона і Брэмена (Германія), Ірана, Бразіліі, Калумбіі, Інданезіі, дзяржаваў Усходняй Еўропы і рэспублік былога СССР.

У неафіцыйным камандным заліку зборная БДУ заняла III месца, прапусціўшы наперад толькі каманды венгерскага і польскага універсітэтаў. Беларусь прадстаўлялі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі нашага універсітэта: Сяргей Маркоўскі, Максім Жыховіч, Дзмітрый Дудко, Алена Пірутка, Мікіта Селінгер. Апрача таго, Сяргей Маркоўскі заняў III месца ў асабістым афіцыйным заліку.

Каманда БДУ ўдзельнічае ў падобных алімпіядах у чацвёрты раз. За 4 гады ўдзелу каманда заваявала 16 залатых, 10 срэбраных і 3 бронзавыя медалі.

*Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ*

ВІНШУЕМ!

## З Алімпійскіх гульняў у Афінах студэнтка БДУ прывезла медаль

У сёлетніх Алімпійскіх гульнях у Афінах удзельнічалі 8 студэнтаў БДУ: 6 з юрыдычнага факультэта, 1 прадстаўнік геаграфічнага факультэта і 1 — факультэта міжнародных адносінаў, вядомы тэнісіст Максім Мірны. Спартсмены выступалі ў розных відах спорту — грэка-рымская і вольная барацьба, тэніс, лёгкая атлетыка, плаванне і інш.

У скарбонцы БДУ адзін медаль, які прывезла Наталля Цылінская — студэнтка IV курса завочнага аддзялення юрыдычнага факультэта. На велатрэку ў дысцыпліне "гіт" яна заваявала бронзавую ўзнагароду.

*Юлія ПАПОВА*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## Даведнік для першакурснікаў

Упершыню ў нашым універсітэце выдадзены "Даведнік для першакурснікаў" ("Путеводитель-справочник для первокурсников"). Яго складальнікамі выступілі супрацоўнікі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Вольга Яраш і Дзяніс Гарагляд. У кнігу ўвайшлі тры раздзелы — "Беларускі дзяржаўны універсітэт", "Мінск" і "Беларусь".

У першым раздзеле змешчаны звесткі з гісторыі БДУ, інфармацыя пра структуру універсітэта, факультэты, арганізацыі. У раздзеле "Мінск" змяшчаецца інфармацыя, неабходная кожнаму: адрасы і тэлефоны дзяржаўных і недзяржаўных прадпрыемстваў, установаў, арганізацый, даведачных і сервісных службаў, аптэк, інтэрнэт-клубаў і г.д. У раздзеле "Беларусь" падаецца цікавая інфармацыя пра гісторыю краіны, дзяржаўныя і прафесійныя святы, цікавыя мясціны Беларусі.

*Вольга БАКАЛЕНКА*

ЮБІЛЕІ

# Гістарычнаму факультэту — 70 гадоў!



Сёлета гістфак адзначае сваё 70-годдзе: факультэт быў афіцыйна адкрыты ў 1934 г., хаця гісторыкаў ва універсітэце рыхтавалі і раней. Кіраўніцтва факультэта запланавала шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею. Плануецца падрыхтаваць і выдаць буклет аб факультэце, юбілейны выпуск “Прац гістарычнага факультэта БДУ”, юбілейны выпуск штогодніка “Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны”, навуковага альманаха “Расійскія і славянскія даследаванні”, навуковага зборніка “Лістападаўскія чытанні”, прысвечанага 70-годдзю факультэта і кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

У верасні адбудуцца навуковыя чытанні, прысвечаныя 65-годдзю ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Плануецца стварыць інфармацыйную старонку ў Інтэрнэце, прысвечаную юбілею факультэта. 1—10 верасня на гістфаку прайшла фотавыстава, прысвечаная гісторыі факультэта. У верасні адбудуцца тыдні кафедраў — ад кафедры археалогіі і сацыяльна-гістарычных дысцыплін і да кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў.

3 верасня адбыўся ўрачысты сход выкладчыкаў, студэнтаў, выпускнікоў факультэта, супрацоўнікаў і святочны юбілейны канцэрт. Павіншаваць факультэт прышло кіраўніцтва БДУ, прадстаўнікі родных факультэтаў іншых ВНУ і інш.

Першым факультэт павіншаваў міністр адукацыі Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў. Ён адзначыў, што гістфак БДУ— галаўная навучальная ўстанова ва ўсёй беларускай гістарычнай адукацыі, а таксама выказаў удзячнасць выкладчыкам за выданні імі аўтарскія дапаможнікі для школ і ВНУ.

Павіншаваць гістфак прыехаў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт. Ён адзначыў, што гістфак вельмі блізкі да духоўных школ, у якіх таксама ўзяты курс на адраджэнне царкоўнай гістарычнай школы.

Павіншаваў гістфак рэктар БДУ Васіль Іванавіч Стражаў. Калі грамадства знаходзіцца на сусветным этапе развіцця, адзначыў рэктар, вельмі важна ведаць вытокі свайго этнасу, вытокі беларускай дзяржаўнасці. БДУ і гістфак робяць усё магчымае на гэтым шляху. Гістарычны факультэт ідзе ў напрамку мадэрнізацыі навучальнага працэсу. На факультэце створаны дзве камп'ютарныя лабараторыі. Рэктар падараваў факультэту яшчэ 3 сучасныя камп'ютары з прынтэрам. Акрамя таго, на прэміі тэхнічнаму і выкладчыцкаму персаналу рэктарат выдзяліў 14,5 млн рублёў.

Ад імя ўсіх дэканаў БДУ з віншавальным словам выступіў дэкан факультэта міжнародных адносін Аляксандр Віктаравіч Шарапа. Ён падзякаваў дэкану і выкладчыкам гістфака за адданасць справе і самаадданасць, пажадаў поспехаў на творчым шляху. Дэканы і рэктарат падаравалі гістфаку два мультымедыйных праектары.

У гэты вечар гістфак атрымаў яшчэ шмат віншаванняў. Цёплыя словы яму адрасавалі прадстаўнікі ВНУ з Брэста, Магілёва, Гомеля, Полацка, Масквы, Бранска, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Прагі ды інш.

Цяперашні дэкан гістфака Сяргей Мікалаевіч Ходзін падзякаваў за ўсе віншаванні і падарункі і сказаў, што зробленае факультэтам за апошнія 5 гадоў было б немагчыма без напрацаванага раней, не адбылося б без падтрымкі рэктарата, выкладчыкаў і калег з родных факультэтаў БДУ і іншых. “Нарастаючыя працэсы глабалізацыі патрабуюць не толькі інтэграцыі новых ведаў, але і здольнасці інтэлектуалаў, перш за ўсё гуманітарыяў, захаваць традыцыі, мову, культуру. Адзінства адукацыі і выхавання для нас з'яўляецца безумоўным і непарушным правілам”, — адзначыў С.М. Ходзін.

*Юлія ПАПОВА*

*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Інтэрнэт-тэхналогіі ў адукацыі

У Рэспубліканскім цэнтры Інтэрнэт-адукацыі, які знаходзіцца па вуліцы Маскоўскай, 15, на сённяшні дзень прайшлі навучанне каля 3 тысяч настаўнікаў сярэдніх школ, дырэктараў школ і супрацоўнікаў аддзелаў адукацыі гарвыканкамаў.

Нагадаем, што Рэспубліканскі цэнтр Інтэрнэт-адукацыі ў Беларусі адкрыўся ў 2001 годзе ў рамках расійскага дзяржаўнага праекта “Пакаленне.RU” і стаў адзінай замежнай адукацыйнай установай, не арыентаванай на расійскую аўдыторыю. У рамках пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Федэрацыяй Інтэрнэт-адукацыі (ФІА) і Беларускім дзяржаўным універсітэтам праект разлічаны на 5 гадоў. Такім чынам, у цэнтры змогуць вывучыць Інтэрнэт-тэхналогіі ў цэлым каля 5 тысяч настаўнікаў. Гэта немалая лічба для таго, каб у нашай краіне паскорыўся працэс камп'ютарызацыі і інфарматызацыі школ. Аднак, калі ўлічыць, што ў сістэме адукацыі Беларусі працуе каля 140 тысяч педагогаў, то хацелася б думаць, што гэта толькі пачатак.



Навучанне ў цэнтры Інтэрнэт-адукацыі ў асноўным агляднае, бо за два тыдні, на працягу якіх настаўнік знаёміцца з камп'ютарнай тэхнікай, нельга навучыць яго ўсім прафесійным момантам. Але тут паказваюць, навошта патрэбен праграмны прадукт, як яго можна выкарыстоўваць падчас выкладання таго або іншага прадмета. Сёння многія яшчэ думаюць, што камп'ютарны клас у школе можа выкарыстоўвацца толькі для заняткаў інфарматыкі. Але тыя, хто прайшоў Інтэрнэт-адукацыю, ведаюць, што і гісторыю, і геаграфію, і тую ж фізіку, матэматыку таксама можна выкладаць у камп'ютарным класе і нават больш дасканала, бо ў Інтэрнэце зараз шмат адукацыйных рэсурсаў і наглядных дапаможнікаў.

Самае важнае, што цэнтр Інтэрнэт-адукацыі поўнасцю забяспечаны ўласнымі вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі і выкарыстоўвае ў выкладанні найноўшыя блочна-модульныя тэхналогіі. Блочна-модульная сістэма працуе такім чынам: матэрыял у падручніку падзелены на тэмы, і кожны выкладчык дасканала асвойвае адну-дзве тэмы, якія і даводзіць да слухачоў. Да ўсяго, бібліятэка вучэбных дапаможнікаў пастаянна пашыраецца. Як толькі асвойваюцца новыя напрамкі, з'яўляюцца і новыя методыкі. На сённяшні дзень цэнтр можа пахваліцца пяццю тамамі дапаможнікаў, падрыхтаваны шосты. Акрамя папяровага варыянту падручніка ёсць электронны: і слухачы, і выкладчыкі могуць карыстацца ўнутранай электроннай сеткай і атрымліваць патрэбны матэрыял з цэнтральнага сервера.

Настаўнікі-прадметнікі гуманітарнай накіраванасці, настаўнікі-прадметнікі прыродазнаўчанавуковага цыкла, настаўнікі інфарматыкі, дырэктары школ і супрацоўнікі аддзелаў адукацыі гарвыканкамаў навучаюцца па розных праграмах. Бываюць і спецыялізаваныя курсы. Ужо два гады запар тут навучаюць бібліятэкараў школ, у гэтым годзе з'явіўся курс для школьных псіхолагаў, існуюць спецыяльныя патокі для супрацоўнікаў сацыяльнай сферы, медсупрацоўнікаў і г.д. Для настаўнікаў-прадметнікаў у цэнтры наладжаны двухтыднёвыя курсы (72 гадзіны), для кіраўнікоў — тыднёвыя (каля 40 гадзін).

Цэнтр можа прыняць для навучання адначасова 40 чалавек. У прасторных аўдыторыях устаноўлены больш за 50 мультымедыйных камп'ютараў, падключаных да глабальнай сеткі Інтэрнэт каналам сувязі з прапускной магчымасцю 128 Кбіт/сек.

Дырэктар Рэспубліканскага цэнтра Інтэрнэт-адукацыі Уладзімір Мікалаевіч Курбацкі спадзяецца, што настаўнікі, якія прайшлі навучанне ў цэнтры, будуць пастаянна карыстацца новай методыкай у сваёй працы і ўдасканальваць яе. Толькі тады інфармацыйныя тэхналогіі і камп'ютар стануць неад'емнай часткай нашага жыцця.

*Ганна ЛАГУН*

АКТУАЛЬНА

# Стратэгія развіцця універсітэта

Улетку адбылося пасяджэнне Вучонага савета універсітэта, на якім абмяркоўвалася Стратэгія развіцця БДУ на 2004—2011 гг. З дакладам “Стан і перспектывы развіцця навучальнага працэсу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце” выступіў рэктар, прафесар В.І. Стражаў.

На пасяджэнні савета была адзначана надзённая неабходнасць у распрацоўцы Стратэгіі развіцця БДУ і канкрэтных праграм яе ажыццяўлення ў наступных кірунках: удасканаленне кіравання і аптымізацыя структуры універсітэта, прафарыентацыйная работа і ўдасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу, ідэалагічная і выхаваўчая работа, навуковая і інавацыйная дзейнасць, супрацоўніцтва з навучальнымі і навуковымі ўстановамі краіны, кадравае забеспячэнне і павышэнне кваліфікацыі, бібліятэчнае абслугоўванне і выдавецкая дзейнасць, сацыяльная падтрымка супрацоўнікаў і студэнтаў, матэрыяльна-тэхнічная база, капітальны рамонт і будаўніцтва.

Па выніках пасяджэння было вырашана ўхваліць Стратэгію развіцця БДУ на 2004—2011 гг., зацвердзіць праграму “Удасканаленне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў (2004—2009 гг.)”, правесці ў 2004/2005 навучальным годзе навукова-метадычную канферэнцыю “Інфармацыйныя тэхналогіі і самастойная работа студэнтаў у ВНУ”. Таксама да 1 снежня 2004 г. рэктарат павінен распрацаваць і зацвердзіць іншыя праграмы развіцця нашага універсітэта.

КАНФЕРЭНЦЫІ

# Вузаўская навука

V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Вузаўская навука, прамысловасць, міжнароднае супрацоўніцтва” адбудзецца ў нашым універсітэце 13—15 кастрычніка. Арганізатарамі яе, апрача БДУ, выступілі Міністэрства адукацыі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, Нацыянальная акадэмія навук, Міністэрства прамысловасці, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Польшчы, Рабочая садружнасць прамысловых даследчых аб'яднанняў Германіі “Ота фон Герыке” (АіФ).

Падчас працы канферэнцыі будуць разглядацца наступныя праблемы:

стан і перспектывы развіцця прыкладных даследаванняў у ВНУ, вузаўскія распрацоўкі для розных сфер гаспадаркі рэспублікі;

праблемы інавацыйнай дзейнасці;

міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхналогіі: рэальнасць, праблемы, перспектывы.

20—23 верасня адбудзецца беларуска-нямецкі кантактны семінар. У рамках канферэнцыі будзе дзейнічаць секцыя “Матэрыялы і структуры сучаснай электронікі”, прысвечаная памяці заснавальніка навуковай школы па фізіцы і тэхніцы паўправаднікоў першага загадчыка кафедры фізікі паўправаднікоў БДУ прафесара В.Д. Ткачова.

Заяўку на ўдзел у канферэнцыі трэба даслаць у аргкамітэт да 17 верасня 2004 г. Інфармацыйны ліст і рэгістрацыйная форма размяшчаюцца на сайце навукова-даследчай часткі БДУ (www.research.bsu.by/vuznauka2004r.htm). Тэлефоны для даведак 209-53-92, 220-74-65.

АКЦЫІ

# Дапаможам дзецям

Летам актывісты універсітэцкага камітэта БРСМ правялі дабрачынную акцыю “Радасць дзецям”, прысвечаную Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Мы наведалі 8 дзіцячых садкоў Маскоўскага раёна Мінска і дзіцячы дом № 3. Падчас гэтай акцыі дзяцей радавалі выступамі дзіцячы ансамбль БДУ “Літарынка” (пад кіраўніцтвам Канстанціна Зубіка), пасля чаго ўсім гадаванцам дзіцячых устаноў уручалі невялікія падарункі, клапатліва падрыхтаваныя Фундаментальнай бібліятэкай БДУ. Мы зразумелі, што кожны можа зрабіць нешта для таго, каб дзіцячы смех ніколі не сканчаўся, што можна хаця б крыху змяніць да лепшага жыццё выхаванцаў дзіцячага дома, дапамагчы ім забыць удары лёсу і асабістыя трагедыі.

*Міхаіл СІМАНЮКОЎ*

ПОСТФАКТУМ

# Спаборніцтвы санітарных дружын

У гэтым годзе каманда БДУ ўпершыню ўзяла ўдзел у традыцыйных штогадовых спаборніцтвах санітарных дружын Маскоўскага раёна.

Сёлета ў спаборніцтве ўдзельнічалі 10 камандаў. У склад каманды БДУ ўвайшлі 14 студэнтаў біялагічнага факультэта на чале з капітанам каманды Марыяй Акбулатавай, студэнткай IV курса. Да спаборніцтва санітарную дружыну БДУ рыхтавала старшы выкладчык кафедры медыцынска-біялагічных тэхналогій біялагічнага факультэта БДУ Людміла Віктараўна Чыж.

Спаборніцтва праходзіла ў чатыры этапы: выкананне групавога нарматыва па надзяванні процівагаза, праверка аснашчэння дружыны; праца санітарнай дружыны ў асяродку камбінаванага паражэння, аказанне першай медыцынскай дапамогі; работа ў асяродку хімічнага паражэння, санітарная дапамога пашкоджаным хімікатамі, іх транспартаванне; апошні этап — конкурс камандзіраў санітарных дружын, які складаўся з тэарэтычных пытанняў.

Каманда БДУ выступіла сапраўды добра і, нягледзячы на дэбют, заняла 5-е месца ў камандным заліку.

*Юлія ПАПОВА*

ЮБІЛЕІ

# Студэнцкаму гарадку БДУ — 30 год!

Сёлета 1 верасня студэнцкаму гарадку БДУ споўнілася 30 год. Датай яго заснавання лічыцца 1 верасня 1974 года.

У рамках святкавання 10 верасня адбылося адкрыццё інтэрната № 2, зачыненага на капітальны рамонт у 2001 г. Цяпер інтэрнат адпавядае ўсім сучасным стандартам. ЗАТ "Пінскдрэў" зрабіла для інтэрната новую мэблю, акрамя таго яго забяспечылі новымі халадзільнікамі, плітамі, пральнымі машынамі і сушыльнымі барабанамі, абсталявалі прасавальні, зрабілі канферэнц-залу, у кожны пакой падвялі разводку для карыстання Інтэрнэтам. Кіраўнікі студгарадка ўпэўнены, што абноўлены інтэрнат мае ўсе падставы быць першым на гарадскіх конкурсах.



Адкрыццё новага інтэрната не адзінае мерапрыемства, якое адбылося ў рамках святкавання юбілею студгарадка. 10 верасня ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ прайшоў святочны канцэрт. Дырэктар студгарадка П.М. Бычкоўскі расказаў пра вынікі, з якімі студгарадок прыйшоў да 30-годдзя. На свяце выступіў рэктар БДУ В.І. Стражаў. "Я мінчанін, таму зайздросціў тым, хто жыў у інтэрнаце, бо жыццё там заўсёды бурліла", — сказаў рэктар і дадаў, што жыццё любога горада вызначаецца яго студгарадкамі і моладдзю, якая там жыве. Рэктар уручыў ганаровыя граматы і падзякі найлепшым студэнтам і супрацоўнікам студгарадка.

Павіншаваць студгарадок са святам прыехала намеснік міністра адукацыі Т.М. Кавалёва. Яна ад імя Мінадукацыі падарыла студгарадку сучасны камп'ютар. Студгарадок атрымаў віншаванні ад прадстаўнікоў адміністрацыі Ленінскага раёна, ад генеральнага дырэктара тэатра імя Янкі Купалы Г.Б. Давыдзькі. Генеральны дырэктар ЗАТ "Пінскдрэў" Л.С. Арыніч падарыў камплект мяккай мэблі і драўляны часопісны столік. Ад калектыву дэканаў і дырэктараў студгарадка выступіў дырэктар студгарадка 1997—2000 гг. І.Р. Вярэнчыкаў. Прыехалі павіншаваць студгарадок з юбілеем дырэктары студгарадкоў БНТУ, БДУІР і БДПУ імя М. Танка.

У гэты вечар студгарадок БДУ атрымаў яшчэ шмат віншаванняў і падарункаў. А студэнты БДУ і лепшыя творчыя калектывы ўніверсітэта падрыхтавалі да свята канцэртную праграму. Напрыканцы святочнай праграмы ўсе ўдзельнікі выйшлі на сцэну і праспявалі традыцыйную песню "Замыкаючы круг". Але на гэтым свята не скончылася. Кожны госць свята паласаваўся марожаным — падарунак, які студгарадку зрабіў холадакамбінат "Марозпрадукт".

*Юлія ПАПОВА*
*Фотаздымак Ірыны ПРЫМАК*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Студэнты — у прыёмнай камісіі

*За час уступнай кампаніі ў грамадскіх прыёмных камісіях працавалі 80 студэнтаў усіх факультэтаў БДУ. У гэтыя камісіі звярнуліся больш за 8000 абітурыентаў. Адна з супрацоўніц грамадскай прыёмнай камісіі распавядае чытачам "Беларускага ўніверсітэта" пра свае ўражанні ад гэтай працы.*

Уступныя іспыты заўжды былі складаным выпрабаваннем для абітурыента. Гэта не толькі праверка яго ведаў, але і ўменне сабрацца, у самы адказны момант не паддацца страху, хваляванню. Студэнты, якія адвучыліся толькі год, яшчэ добра памятаюць свае леташнія перажыванні. Можа, таму я і вырашыла папрацаваць у грамадскай прыёмнай камісіі.

У першыя гадзіны працы было страшнавата: анкеты, заявы, сертыфікаты, атэстаты, пашпарты і, вядома, дзяўчаты і хлопцы, якія хвалююцца, а часам баяцца няправільна напісаць слова ў заяве. А былі і такія, хто, сядаючы запаўняць заяву, вырашаў, на які факультэт паступаць. Да розных абітурыентаў трэба было ставіцца па-рознаму. Мы не забывалі, што былі першымі людзьмі, да якіх прыходзілі абітурыенты — менавіта мы стваралі агульнае ўражанне пра ўніверсітэт.

Мне здалося, што час працы ў грамадскай прыёмнай камісіі праляцеў вельмі хутка і быў насычаны падзеямі і знаёмствамі. Наступным летам я хацела б зноў папрацаваць у ёй.

*Вольга БАКАЛЕНКА,*
*студэнтка ІІ курса юрыдычнага факультэта*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Падведзены вынікі прыёмнай кампаніі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

выпадку экзамен уключаў у сябе сачыненне і творчае тэсціраванне, у другім — малюнак і вольную кампазіцыю.

Дзяржаўную камісію па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных экзаменаў узначальваў намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта А.В. Праляскоўскі. У склад прадметных экзаменацыйных камісій былі ўведзены члены рэзервовых экзаменацыйных камісій, сфарміраваных з настаўнікаў школ, гімназій, ліцэяў.

У адпаведнасці з "Правіламі прыёму ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, на 2004 год" конкурс вызначаўся па выніках трох экзаменаў, адзін з якіх (руская ці беларуская мова) быў абавязковым для ўсіх і праводзіўся ў форме цэнтралізаванага тэсціравання. Па гэтым экзамене абітурыент павінен быў прадставіць у БДУ сертыфікат цэнтралізаванага тэсціравання. Два другія экзамены абітурыенты маглі здаваць у ВНУ. Праўда, па шэрагу дысцыплін, па якіх Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў праводзіў цэнтралізаванае тэсціраванне, абітурыент пры паступленні таксама мог падаць сертыфікат. Вызначыцца наконт выбару — падаваць, ці не падаваць сертыфікат — абітурыентам было вельмі нялёгка, асабліва тым, у каго стаяла адзнака "6", "7" ці "8". І хаця прыёмная камісія штодня вывешвала інфармацыю па ўсіх спецыяльнасцях наконт таго, якія сертыфікаты былі пададзены абітурыентамі пры ўмове, што абітурыент падаў 2 або 3 сертыфікаты, пэўнасці гэта не дадавала, бо невядомымі заставаліся вынікі ўступных экзаменаў.

Нягледзячы на пэўную рызыку досыць вялікая колькасць абітурыентаў падалі ў прыёмную камісію два (1931) ці нават тры (774) сертыфікаты. Тым, хто падаў тры сертыфікаты, трэба было толькі чакаць вынікаў уступных экзаменаў для вызначэння прахаднога бала. З 774 чалавек, якія падалі 3 сертыфікаты, студэнтамі БДУ сталі 605.

На дзённую форму навучання ў БДУ ў 2004 г. было пададзена 8413 заяваў на 2000 планавых месцаў, на завочную — 750 заяваў на 450 месцаў. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце на дзённую форму навучання выявіўся самым высокім за апошнія 40 гадоў і склаў 4,2 чалавека на месца, на завочную форму — 1,7. На некаторыя спецыяльнасці: хімія (кірунак — ахова навакольнага асяроддзя), рамана-германская (англійская) філалогія, лінгвакраіназнаўства, міжнароднае права, сучасныя замежныя мовы і інш. — конкурс склаў 10—15 чалавек на месца, а пасля залічэння без экзаменаў пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і па-за конкурсам асобаў, якія маюць на гэта права паводле дзеючага заканадаўства, конкурс склаў 20—27 чалавек на месца.

Асаблівая сітуацыя склалася на спецыяльнасці "міжнародныя адносіны". Хаця магчымасць яе ўзнікнення кіраўніцтва факультэта міжнародных адносін і ўніверсітэта прагназавала яшчэ ў красавіку, Міністэрства адукацыі тады палічыла трывогу залішняй. У выніку на 20 планавых месцаў спецыяльнасці "міжнародныя адносіны" заяваў ад абітурыентаў, якія карыстаюцца ільготамі пры паступленні (без экзаменаў і па-за конкурсам), было пададзена больш, чым выдзелена месцаў. Такім чынам, узнікла сітуацыя, калі 316 абітурыентаў апынуліся па-за ўдзелам у конкурсе, бо на конкурс не засталося ніводнага месца. У гэтай надзвычайнай сітуацыі пры адсутнасці рэзервовых месцаў не толькі ў БДУ, але і ў Міністэрства адукацыі, кіраўніцтва ўніверсітэта пайшло насустрач абітурыентам, вылучыўшы 15 месцаў на платнай форме навучання і вызваліўшы ад аплаты на 2004/2005 навучальны год абітурыентаў, якія прайшлі па конкурсе на гэтыя месцы.

Нечакана высокім выявіўся конкурс на прыродазнаўчыя спецыяльнасці. Калі конкурс на біялагічны факультэт традыцыйна высокі, дык 6—10 чалавек на месца — конкурс незвычайны для розных кірункаў спецыяльнасці "хімія". Высокі конкурс быў і на ваенным факультэце: на спецыяльнасці "псіхалогія" і "міжнародныя адносіны" ён склаў 5 чалавек на месца. Упершыню было дазволена паступаць на ваенны факультэт дзяўчатам, і яны годна змагаліся: шэсць дзяўчат паступілі на спецыяльнасць "міжнародныя адносіны" і адна — на спецыяльнасць "журналістыка".

Упершыню сёлета быў абвешчаны набор на новую спецыяльнасць "бізнес-адміністраванне". На жаль, інфармацыя пра гэта патрапіла да абітурыентаў толькі напярэдадні прыёму дакументаў. Таму ў першыя дні каля стала, дзе прымалі дакументы на гэтую спецыяльнасць, было спакойна. Але праз 2 дні пайшлі заявы. У выніку конкурс на гэтую спецыяльнасць склаў амаль 4 чалавекі на месца.

У бягучым годзе выпускнікі сельскіх школ паступалі паводле асобнага конкурсу. У прыёмную камісію паступіла 1090 заяваў ад выпускнікоў сельскіх школ. У парадку эксперыменту ўніверсітэт вылучыў 27 месцаў для выпускнікоў сельскіх школ Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія з'яўляліся ўдзельнікамі абласных алімпіяд па беларускай і рускай мовах, замежных мовах, матэматыцы, гісторыі, геаграфіі, мэтавыя месцы на спецыяльнасці факультэтаў міжнародных адносін, эканамічнага і юрыдычнага. На гэтыя месцы была пададзена 31 заява, паводле конкурсу было залічана 14 чалавек. Дзякуючы праведзеным прыёмнай камісіяй БДУ мерапрыемствам колькасць залічаных на дзённую форму навучання выпускнікоў сельскіх школ павялічылася да 13 % ад прынятых, у той час як у папярэднія гады гэты паказчык складаў 7—10 %. У 2004 г. на бюджэтную форму навучання ў БДУ паступілі 264 выпускнікі сельскіх школ (у 2003 г. — 198). На факультэт міжнародных адносін у бягучым годзе залічана ўдвая больш выпускнікоў сельскіх школ, чым у 2003 г. (адпаведна 14 чалавек, ці 12,5 % ад плана прыёму, і 7 чалавек, ці 5,2 %). На юрыдычны факультэт у 2004 г. залічана 28 выпускнікоў сельскіх школ (16,5 %), у 2003 г. іх было 14 (8,2 %).

З улікам сітуацыі (вялікі конкурс, неймаверная колькасць дзяўчат і хлопцаў, якія імкнуліся вучыцца ў БДУ) для таго каб даць магчымасць абітурыентам навучацца на абраных факультэтах, хай сабе і за грошы, кіраўніцтва БДУ прыняло рашэнне пра павелічэнне плана набору на платную форму навучання. Аднак не ўсе жадаючыя патрапілі нават на платнае навучанне: на дзённую форму паводле конкурсу было залічана 1762 чалавекі, на завочную — 366.

Сёлета зменшылася колькасць студэнтаў БДУ платнай формы навучання, якія перапаступаюць на бюджэтныя месцы. Гэта звязана з умовай абавязковага адлічэння з ліку студэнтаў для таго, каб падаць дакументы ў прыёмную камісію. Такая жорсткая ўмова выклікала шматлікія арганізацыйныя праблемы. Студэнты былі вымушаны здаваць сесію датэрмінова (на многіх факультэтах яна паводле графіка заканчвалася 30 чэрвеня), павінны былі афармляць абходныя лісты, высяляцца з інтэрната і г.д. Асабліва гэта закранула хлопцаў, бо адлічэнне аўтаматычна адмяняла адтэрміноўку ад вайсковай службы на перыяд навучання ў ВНУ. Універсітэт пастараўся максімальна спрасціць ім задачу, распрацаваўшы механізм перапаступлення, хаця гэта вяло да дадатковай нагрузкі на прыёмную камісію і службы ўніверсітэта.

Асаблівасцю сёлетняй кампаніі была і вялікая колькасць абітурыентаў, якія набралі паўпрахадны бал. Мала якія спецыяльнасці пазбеглі гэтага. У адпаведнасці з правіламі пры аднолькавай колькасці набраных балаў уступалі ў сілу іншыя ўмовы, сярод якіх апошнім ішоў сярэдні бал атэстата. На некаторых спецыяльнасцях паступленне ці непаступленне вызначалася адрозненнямі ў некалькі сотых у сярэднім бале атэстата.

Вялізная колькасць абітурыентаў, нераўнамернасць іх размеркавання па розных спецыяльнасцях прывялі да праблем, звязаных з забяспечанасцю аўдыторным фондам, і неабходнасцю змяніць расклад экзаменаў. У адзін з дзён нават давялося паставіць экзамены ў дзве змены.

Перад прыёмнай камісіяй узнікалі і складанасці матэрыяльна-тэхнічнага характару. Паколькі ўсе экзамены праводзіліся ў форме пісьмовых тэстаў, у дзень экзамену пасля правядзення жараб'ёўкі варыянтаў заданняў даводзілася на працягу кароткага часу забяспечваць размнажэнне 8000—9000 копій. Толькі загадзя спланаваная і добра арганізаваная праца дазволіла звесці да мінімуму чаканне абітурыентамі тэставых заданняў у аўдыторыях.

Нягледзячы на ўсё больш разнастайныя метады атрымання несанкцыяванай інфармацыі на экзамене (пейджары, мабільныя тэлефоны і нш.), уступныя экзамены прайшлі без эксцэсаў і ў працоўнай атмасферы. Часткова гэта абумоўлена тым, што і абітурыенты, і выкладчыкі прайшлі практыку правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. З аўдыторыі быў выдалены толькі адзін абітурыент, які спрабаваў здаваць экзамен з дапамогай... мабільнага тэлефона.

У цэлым варта адзначыць, што прыёмная кампанія ў БДУ прайшла паспяхова. Трэба сказаць словы падзякі ўсім, хто прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні ўступных экзаменаў. Усе працавалі сумленна, і нашыя намаганні не былі дарэмнымі. Мы ўпэўненыя, што ў БДУ паступілі найлепшыя. Жадаем новым студэнтам поспехаў у навучанні і спадзяемся, што яны будуць з годнасцю несці высокае званне студэнта БДУ.

*А.І. ХМЯЛЬНІЦКІ,*
*адказны сакратар*
*прыёмнай камісіі*


АБ'ЯВЫ

## ЛІЦЭЙ БДУ ЗАПРАШАЕ

Вучэбна-адукацыйная ўстанова "Ліцэй БДУ" аб'яўляе набор на падрыхтоўчыя курсы для навучэнцаў 8—11 класаў па наступных дысцыплінах: фізіка, матэматыка, хімія, біялогія, гісторыя, руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура.

У праграме навучання:

падрыхтоўка да ўступных экзаменаў у ліцэй БДУ;

паглыбленая падрыхтоўка па прадметах (8—11-я класы);

падрыхтоўка да ўступных іспытаў у ВНУ (11 клас);

падрыхтоўка да здачы цэнтралізаванага тэсціравання (11 клас).

Пачатак заняткаў у групах па меры камплектавання.

*Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8, каб. 100. Тэлефон для даведак і запісу ў групы 209-56-19 (з 9.00 да 17.30).*

## УСТАНОВА БДУ "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:*

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі тэрмадынамікі арганічных рэчываў;

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;

навуковага супрацоўніка лабараторыі фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы (2 чалавекі);

навуковага супрацоўніка лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных поліцукрыдаў;

малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі іонаметрыі і хімічнай метралогіі;

малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі ультрадысперсных і нанаструктураваных сістэм;

малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі структурна-хімічнага мадыфікавання палімераў.

*Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ, тэл. 226-56-41.*

АКТУАЛЬНА

# Атрымліваць падручнікі групамі ці індывідуальна?

Аддзел абслугоўвання навучальнай літаратурай Фундаментальнай бібліятэкі БДУ распрацаваў анкету для студэнтаў II—III курсаў геаграфічнага, фізічнага, гістарычнага, механіка-матэматычнага факультэтаў, а таксама факультэтаў журналістыкі і прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, каб вызначыць, які з метадаў абслугоўвання студэнтаў камплектамі навучальных выданняў лепшы.

Абслугоўванне студэнтаў можа адбывацца індывідуальным і групавым метадам. Групавы метад быў разлічаны на раўнамернае размеркаванне фонду навучальнай літаратуры па факультэтах і групах, бо многія дысцыпліны вывучаюцца адначасова на некалькіх факультэтах. Адна з пераваг групавога метаду абслугоўвання — выдача літаратуры паводле загадзя складзенага графіка, што дазваляе пазбегнуць чэргаў у бібліятэцы і зэканоміць час студэнтаў. У пачатку кожнага навучальнага года на абанемент навучальнай літаратуры прадастаўляліся пералікі дысцыплін, якія вывучаюць на факультэтах. На падставе гэтых дакументаў бібліятэкары фарміравалі камплекты навучальнай літаратуры на ўвесь навучальны год і выдавалі яе студэнтам у адпаведнасці з графікам абслугоўвання груп.

Цяпер камплекты фарміруюць студэнты разам з бібліятэкарам на падставе пераліку дысцыплін і спісаў рэкамендаванай навучальнай літаратуры. Паводле гэтых спісаў, камплекты атрымліваюцца сфарміраванымі пераважна на першы семестр, і на пачатку другога семестра атрымліваюцца вялікія чэргі на атрыманне навучальнай літаратуры.

Перад супрацоўнікамі бібліятэкі паўстала пытанне: як арганізаваць выдачу кніг, каб найбольш поўна задаволіць патрэбы студэнтаў у навучальнай літаратуры, раўнамерна размяркоўваючы яе па групах, і пазбегнуць вялікіх чэргаў у бібліятэках? Адказ на гэтае пытанне мы спадзяемся атрымаць пасля аналізу прапанаванай студэнтам анкеты. Анкеты будуць распаўсюджвацца праз старастаў груп. Просім вас сур'ёзна паставіцца да гэтага апытання, бо ад вашых прапаноў будзе залежаць арганізацыя выдачы навучальнай літаратуры.

*В.М. ПАПЛЕЎКА,*
*загадчыца аддзела абслугоўвання навучальнай літаратурай Фундаментальнай бібліятэкі БДУ*

КОНКУРСЫ

# Чытачы ўдасканаляць працу бібліятэкі

З 1 кастрычніка па 29 снежня 2004 г. у Фундаментальнай бібліятэцы БДУ будзе праходзіць конкурс інавацый і ідэй сярод аддзелаў абслугоўвання, арганізаваны з мэтай актывізацыі і ўдасканалення работы, выяўлення і распаўсюджвання новых ідэй, фарміравання станоўчага іміджу бібліятэкі. На ўсіх пунктах выдачы літаратуры (і ў галоўным корпусе, і на філіялах) устаноўлены скрынкі для запісак наведвальнікаў. Усе прапановы, заўвагі, пажаданні абавязкова будуць разгледжаны арганізацыйным камітэтам і журы конкурсу.

*Навукова-метадычны аддзел ФБ БДУ*

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# БДУ адпачывае ў "Брыганціне"

Дзе адпачыць — пытанне летняе. Многія супрацоўнікі нашага універсітэта гэтым летам вырашылі для сябе гэтую праблему лёгка і без ваганняў: адпачываць трэба ў "Брыганціне".

Спартыўна-аздараўляльны комплекс "Брыганціна", што знаходзіцца бліз Радашковічаў, перададзены на баланс БДУ ў верасні 2002 г. Комплекс займае тэрыторыю ў 13,8 га. Адпачывальнікі размяшчаюцца ў 3 двухпавярховых спальных карпусах. Пакоі з выхадам на балкон разлічаны на 4 чалавекі. Сталовая на 400 месцаў мае 2 залы — зімовую і летнюю. Да паслуг адпачывальнікаў — лекавы корпус, вялікая актавая зала, кінатэатр, спартыўная зала, плавальны басейн, валейбольная і баскетбольная пляцоўка, футбольнае поле. За 150 м ад комплекса — гідрапарк з вадаспадамі, альтанкамі, фантанамі, лавачкамі, пляжам.

У чэрвені-жніўні ў "Брыганціне" ў 3 змены па 18 дзён было наладжана аздараўленне дзяцей супрацоўнікаў БДУ. З 4 жніўня комплекс быў аддадзены для адпачынку супрацоўнікам (2 заезды па 12 дзён). Усяго гэтым летам у лагеры адпачылі 378 дзяцей і 413 супрацоўнікаў БДУ.

Дырэктар "Брыганціны" Уладзімір Аляксандравіч Палякоў кажа, што перад комплексам сёння стаяць важныя гаспадарчыя задачы: "Гэта пабудова кацельні, каб скараціць немалыя энергетычныя затраты. Трэба рэканструяваць спартыўны корпус: басейн, спортзалу, — а таксама актавую залу і сталовую. Пачнем мы з рэстаўрацыі страхі, бо яна не рамантавалася ад моманту будаўніцтва. Далейшы этап — рэканструкцыя першага спальнага корпуса, які мы не абслугоўваем ужо 5 гадоў. У перспектыве мы плануем зрабіць у гэтым будынку двухмясцовыя нумары палепшанага планавання: мы зменшым колькасць адпачывальнікаў, але палепшым якасць адпачынку. Таксама мы хочам узняць лекавую базу, вярнуцца да аздараўленчай праграмы".

*Іна СТРАЛЯЕВА*

СВЯТЫ

# На радзіме Залатавуста

На пачатку верасня ўжо адзінаццаты раз краіна святкавала Дзень беларускага пісьменства. Цэнтрам свята зноў стаў старажытны горад Тураў. З гэтай гістарычнай мясцінай непарыўна звязана імя вядомага асветніка, царкоўна-палітычнага дзеяча, пісьменніка-прапаведніка Кірылы Тураўскага, якога нашы продкі называлі "Златоустом, паче всех воссиявших нам на Руси".

У гэты дзень у храме ў гонар Усіх Святых прайшла літургія, а потым шэсце накіравалася на Замкавую гару да помніка Кірылу Тураўскаму, дзе і адбылося ўрачыстае адкрыццё свята.

По запрашэнні Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь удзел у святочных мерапрыемствах прымаў і Беларускі дзяржаўны універсітэт. У Тураў выехала група супрацоўнікаў упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ і РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ", а таксама аўтары выдадзеных у БДУ кніг, якія ўдзельнічалі ў прэзентацыях.



*Аўтары і работнікі выдавецтва каля экспазіцыі кніг БДУ*

Павільён Беларускага дзяржаўнага універсітэта знаходзіўся ля галоўнай плыні свята на Замкавую гару. Яркія вокладкі універсітэцкіх кніг прыцягвалі ўвагу, з вялікім уздымам прайшлі прэзентацыі. Пад мілагучны звон цымбалаў выступілі аўтары: доктар гістарычных навук, прафесар Э.М. Загарульскі; доктар філалагічных навук, прафесар загадчык кафедры тэорыі літаратуры В.П. Рагойша; кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры класічнай філалогіі Г.І. Шаўчэнка.

Госці свята даведаліся пра навінкі універсітэцкага кнігавыдання, пазнаёміліся з перыядычнымі выданнямі — свежымі нумарамі часопісаў "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта", "Социология", газетай "Беларускі універсітэт", з задавальненнем набылі вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі, даведачную літаратуру.

Свята закончылася, але яно пакінула светлыя ўражанні, дало добры імпульс на будучае — памнажаць выданне змястоўных і карысных кніг, працягваць асветніцкую справу нашых славутых продкаў.

*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы*



*Помнік Кірылу Тураўскаму на яго радзіме (скульптар М. Інькоў, архітэктар М. Лук'янчык)*

*P.S. Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы выказвае шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства, прысвечанага Дням беларускага пісьменства, і ў першую чаргу рэктарату БДУ, а таксама кіраўніцтву: Фундаментальнай бібліятэкі; РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"; аўтамабільнай гаспадаркі БДУ; Галоўнага ўпраўлення планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў; упраўлення па справах культуры БДУ; ВУП "Камбінат грамадскага харчавання"; Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ.*

АБ'ЯВЫ

# Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

ЗАПРАШАЕ НА КУРСЫ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ
Ў ВЕРАСНІ-СНЕЖНІ 2004 Г.
ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА
ПА НАСТУПНЫХ НАПРАМКАХ:

**1.** Статыстычны аналіз і апрацоўка даных на персанальным камп'ютары (для выкладчыкаў сацыялогіі, эканомікі, псіхалогіі, геаграфіі, біялогіі, медыцыны, супрацоўнікаў вучэбных аддзелаў і інфармацыйна-аналітычных службаў устаноў сістэмы адукацыі) — вочна-завочная, **20.09—17.12**;

**2.** Офісныя і Internet-тэхналогіі ў адукацыі (для прафесарска-выкладчыцкага складу і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ, сістэмы ПК і перападрыхтоўкі кадраў) — вочна-завочная, **20.09—17.12**;

**3.** Англійская і нямецкая мова (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) — вочна-завочная, **20.09—27.11**;

**4.** Кіраванне самастойнай работай студэнтаў з выкарыстаннем элементаў паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, навуковых супрацоўнікаў ВНУ) — вочна-завочная, **20.09—17.12**;

**5.** Педагагічнае майстэрства выкладчыка: сутнасць, змест, сродкі фарміравання (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная, **22.09—28.10**;

**6.** Выкарыстанне сістэм камп'ютарнай матэматыкі ў адукацыі і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў прыродазнаўчых і тэхнічных дысцыплін ВНУ, сістэмы ПК) — вочная, **04.10—16.10**;

**7.** Прыродазнаўства ў сістэме культуры (для выкладчыкаў гуманітарных і інтэграваных курсаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная, **04.10—04.12**;

**8.** Менеджмент сучаснай вышэйшай школы (для начальнікаў і інспектараў аддзелаў кадраў ВНУ) — вочная, **04.10—08.10**;

**9.** Распрацоўка электронных матэрыялаў для дыстанцыйнага навучання (для прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ, сістэмы ПК) — вочная, **04.10—16.10**;

**10.** Эканамічная навука ў перыяд трансфармацый. Ідэалогія беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная, **05.10—10.11**;

**11.** Псіхалагічнае здароўе выкладчыка і прафесійная надзейнасць (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная, **06.10—11.11**;

**12.** Актуальныя праблемы выкладання сацыяльна-палітычных навук: тэорыя, педагагічныя тэхналогіі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная, **11.10—23.10**;

**13.** Сучасная этыка: тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная, **18.10—30.10**;

**14.** Беларуская эканамічная мадэль — кампанент ідэалогіі беларускай дзяржавы (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная, **18.10—30.10**;

**15.** Вытокі беларускай дзяржаўнасці і нацыянальная ідэя (для выкладчыкаў беларусазнаўчых дысцыплін і ідэалагічнага актыву ўстаноў адукацыі) — вочная, **25.10—06.11**;

**16.** Кафедра — цэнтр вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы ва ўмовах дзвюхступенчатай падрыхтоўкі спецыялістаў (для загадчыкаў кафедраў) — вочная, **25.10—05.11**;

**17.** Чалавек. Грамадства. Дзяржава: роля дысцыпліны ў фарміраванні светапогляду і ідэалагічным выхаванні (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная, **25.10—24.12**;

**18.** Вучэбна-метадычны комплекс у сістэме прыродазнаўчай адукацыі (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная, **25.10—18.12**;

**19.** Актыўныя метады навучання ў вышэйшай школе (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная, **25.10—06.11**;

**20.** Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі распрацоўкі электронных вучэбных матэрыялаў (для прафесарска-выкладчыцкага складу і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ, сістэмы ПК) — вочная, **01.11—13.11**;

**21.** Праектаванне і распрацоўка стандартаў, мадэляў і адукацыйных праграм па цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўмовах дзвюхступенчатай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная, **01.11—18.12**;

**22.** Псіхалагічнае здароўе выкладчыка і прафесійная надзейнасць (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна-завочная, **10.11—16.12**;

**23.** Праектаванне спецыяльнасцей і кваліфікацый (для кіраўнікоў і спецыялістаў устаноў адукацыі) — вочная, **15.11—19.11**;

**24.** Сучасныя тэхналогіі адукацыі (для вядучых спецыялістаў Міністэрства адукацыі, дэканаў, намеснікаў дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедраў ВНУ) — вочная, **15.11—20.11**;

**25.** Правы чалавека і дзяржаўная ідэалогія Беларусі: пытанні тэорыі і методыкі выкладання (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная, **15.11—27.11**;

**26.** Асновы сацыяльнага менеджменту ва ўмовах дзвюхступенчатай падрыхтоўкі спецыялістаў (для загадчыкаў інтэрнатаў навучальных устаноў) — вочная, **22.11—03.12**;

**27.** Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў забеспячэнні і выкладанні прыродазнаўчых дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная, **22.11—24.12**;

28. Асновы права (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная, 06.12—18.12.

*Калі вас зацікавіла наша інфармацыя і вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 220-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.*

**Наш адрас: 220007 г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, тэл/факс 220-25-51**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*16 верасня 2004 г.*

*Падпісана да друку 15.09.2004 г.*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 818. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

**Рэдактар Таццяна КАЗАК**

*Адрас рэдакцыі:*
*220050, Мінск,*
*Універсітэцкі гарадок,*
*вул. Бабруйская, 7,*
*паверх 4, пакой 411,*
*тэлефон 209-53-45,*
*e-mail: Gazeta@bsu.by*